

ЯК ВЫХАВАЦЬ ГУМАНІЗМ І ПАТРЫЯТЫЗМ 3

НА ВЫХАДНЫХ — СПЁКА І НАВАЛЬНІЦЫ 16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

16 ЖНІЎНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 159 (30293)


## КОРАТКА

• Вытворчасць сельгаспрадукцыі ў гаспадарках усіх катэгорый у студзені — ліпені 2024 года ў бягучых цэнах склала Br16,4 млрд і павялічылася ў параўнанні са студзенем — ліпенем 2023 года ў супастаўных цэнах на 18 %.

• **Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ў студзені — чэрвені 2024 года склалі 109,6 працэнта да ўзроўню студзеня — чэрвеня 2023 года.**



• Аграрыі Мінскай вобласці намалацілі каля 2 млн тон збожжа з улікам рапсу.

• **Экспазіцыя Беларусі прадстаўлена на харчовай выставе ў Ганконгу.**

• У Беларусі мабільныя аператары павышаюць тарыфы на паслугі.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід МАРТЫНЮК, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці:**

*«Работа мясцовай вертыкалі ўлады палягае ў тым, каб бачыць пытанні тут, на месцах. Бо гэта людзі, якія непасрэдна знаходзяцца там, дзе праблема можа ўзнікнуць. А самая галоўная задача мясцовых улад, з майго пункту гледжання, — працаваць на апераджэнне. Трэба працаваць так і бачыць тую ці іншую праблему, якая можа ўзнікнуць праз месяц ці пазней. І зрабіць усё неабходнае, каб гэтага пытання не было».*

З першых вуснаў

# Пра безадказных палітыкаў, «чырвоныя лініі» і «стаяць спіна да спіны»

### Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю тэлеканалу «Расія»

**Інтэрв'юерам у беларускага лідара выступіў журналіст, вядучы грамадска-палітычнага ток-шоу «60 хвілін», дэпутат Дзяржаўнай думы Расійскай Федэрацыі Яўген Папоў. На працягу двух гадзін кіраўнік дзяржавы адкрыта і падрабязна адказваў на пытанні, якія закранаюць шырокае кола тэм. Журналіста цікавіла пазіцыя Аляксандра Лукашэнкі наконт рэгіянальнага і міжнароднага парадку дня. Акрамя таго, узнімаліся пытанні, якія датычацца супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, бяспекі ў рэгіёне, шляхоў урэгулявання канфлікту ва Украіне. Не абышлося і без самых вострых і гарачых тэм.**



Фота БелТА.

**«Не адыгрывалі і не адыгрываюць у гісторыі сёння ніякай ролі»**

Першае пытанне, якое журналіст адрасаваў беларускаму лідару, датычылася рэакцыі Прэзідэнта на забарону літоўскіх улад на ўезд легкавых аўтамабіляў з беларускімі нумарамі ў гэтую краіну. «Вар'яты, — пракаментаваў Аляксандр Лукашэнка. — Я б на вашым месцы многія пытанні, якія датычаца Літвы, і не каментаваў бы. Бо яны не ведаюць самі, што робяць. Гэта вар'яты, самыя сапраўдныя вар'яты. Ну што пра іх казаць. Калі б там былі адказныя палітыкі, мы маглі б абмяркоўваць іх палітыку. Але там адказных палітыкаў няма».

Пры гэтым, па словах кіраўніка дзяржавы, ёсць у гэтым рашэнні і станоўчы момант для айчыннай эканомікі. «Дзякуй богу, нашы пераступяць вывозіць (хоць цяпер паменш стала) грошы за межы Беларусі і Расіі, — патлумачыў ён. — Тое ж самае — расіяне. Грошы застануцца тут. Гэты так званы эканамічны турызм — вялізныя сродкі, якія вывозіліся адсюль. Давайце адкрыта казаць: у Еўрапейскім саюзе (я не кажу пра Літву, там ужо нічога жывога не засталося) усё ж яны не дурні. Яны да Польшчы, Літвы, Латвіі сцягвалі тавары свае, і расіяне і беларусы плынню туды ездзілі і вялізныя грошы, мільярды долараў, вывозілі. Ну, цяпер не будуць вывозіць».

Беларускі лідар параіў проста не звяртаць увагі на гэтае вар'яцтва, якім у тым ліку з'яўляецца рашэнне Літвы забараніць на тэрыторыю сваёй краіны ўезд машын з беларускімі нумарамі. «Можа, недзе праз коску як прыклад прыводзіць вар'яцтвы гэтага Захаду і Еўрапейскага саюза, і да чаго яны могуць давесці гэтых сваіх сатэлітаў, якія не адыгрывалі і не адыгрываюць у гісторыі сёння ніякай ролі», — парэкамендаваў журналісту Аляксандр Лукашэнка.

**«Сапраўдныя дыпламаты сабе такога не дазволяць»**

Адно з пытанняў датычылася хамскага адказу з боку ўкраінскага Міністэрства замежных спраў на заяву беларускага знешнепалітычнага ведамства наконт парушэння беспілотнікамі паветранай прасторы нашай краіны, якое было зафіксавана на мінулым тыдні. Украінскія афіцыйныя асобы адказалі, што ў гэтай тэме няма чаго і абмяркоўваць, па іх словах, гэта не тое, пра што трэба задумвацца.

Па словах Прэзідэнта Беларусі, такія хамскія паводзіны ідуць яшчэ з часоў студыі «Квартал 95» (кампанія па вытворчасці забаўляльнага кантэнту, адным з заснавальнікаў якой з'яўляецца Уладзімір Зяленскі). «Сапраўдныя дыпламаты сабе такога не дазволяць, нават калі «няма чаго абмяркоўваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта па-першае. А па-другое, дыпламаты пастаянна гавораць тое, што яны не думаюць».

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што пасля інцыдэнту з беспілотнікамі і заяў, дзеянняў беларускага боку была атрымана рэакцыя ад украінскага боку. Прэзідэнт удакладніў, што пэўная мітусня з іх боку адбывалася на фоне дадатковых мер па ахове Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь. «Яны ж перакінулі падраздзяленні да нашай граніцы дадаткова, калі ўбачылі, што мы фарміруем адпаведныя падраздзяленні на граніцы, — праінфармаваў Аляксандр Лукашэнка. — Яны (нашы падраздзяленні. — **«Зв».**) занялі свае пазіцыі (пазіцыі, якія намі вызначаны былі даўно). Я прыхільнік таго, каб мы прадугледжвалі ўсё. Калі раптам момант ці час «Ч», кожнае падраздзяленне, рота, батальён павінны выйсці і стаць на сваю пазіцыю».

У Беларусі вызначаны брыгады, батальённыя тактычныя групы для дзеянняў у раёне беларуска-ўкраінскай дзяржаўнай граніцы. Па словах Галоўнакамандуючага, кожная група ведае, якую мясцовасць яны займаюць, тэрыторыю і гэтак далей. І ўкраінскі бок гэта ўбачыў.

СТАР. 2

Сезонны клопат

# ЧАЦВЁРТЫМ УКОСАМ

### Гаспадаркі Брэстчыны працягваюць нарыхтоўку травасумесяў і выбарачна ўбіраюць кукурузу

**Аграрыі краіны завяршаюць уборку збожжавых і зернебабовых культур. Брэстчына з гэтай работай справілася першай. Некаторыя раёны вобласці адсвяткавалі дажынкі, шэраг раёнаў справяць свята ўраджаю ў найбліжэйшыя выхадныя. Але ж работы ў палях не збаўляюць абароту. І адной з найважнейшых задач, якую вырашаюць земляробы, з'яўляецца нарыхтоўка кармоў для грамадскага пагалоўя. Гэта работа пачынаецца ў канцы вясны і працягваецца да позняй восені. Многія гаспадаркі вядуць трэці ўкос траў, а дзе-нідзе — нават і чацвёрты.**

Камунальнае сельскагаспадарчае прадпрыемства «Беражное» Столінскага раёна мае мяса-малочны кірунак і ў апошнія гады істотна нарошчвае аб'ёмы вытворчасці. За дзень фермы гаспадаркі адгружаюць 24 тоны малака. Папаўненне запасаў якасных кармоў — заўсёды на парадку дня кіраўніцтва гаспадаркі.

СТАР. 3



Фота БелТА.

Турызм

# ДАКРАНУЦЦА ДА РОДНАЙ ГІСТОРЫІ

### Чаму цікава вандраваць па Беларусі



**Папулярнасць унутранага турызму расце. Пры гэтым назіраецца тэндэнцыя да індывідуальных падарожжаў. Яшчэ нядаўна многія адпраўляліся ў турыстычныя паездкі цэнтралізаваным траспартам. Такая практыка застаецца — набыць тур нескладана. Але ўсё часцей беларусы адпраўляюцца вандраваць па сваёй краіне вузкім сямейным колам. І гэта не толькі магчымасць свабодна распараджацца сваім часам, але і пошук невядомых славутасцяў, якія не заўсёды ўваходзяць у праграму турыстычнай паездкі. Госці Гродна падзяліліся з карэспандэнтам «Звязды» не толькі сваімі эмоцыямі, але і «дарожнай картай» вандровак.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

# Пра безадказных палітыкаў, «чырвоныя лініі» і «стаяць спіна да спіны»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Яны пастаянна нам гаварылі, і заходнікі, што ім вайна з Беларуссю не патрэбна, — нагадаў Прэзідэнт. — Мы гэта разумеем і гаворым, што мы не збіраемся з вамі ваяваць». Па словах кіраўніка дзяржавы, адсутнасць ваяўнічых намераў абумоўлена не тым, што на тым баку нехта добры, а нехта — не, а тым, што Беларусь і Расія не зацікаўлены павялічваць лінію баявых дзеянняў.

«Мы не хочам эскалацыі, і мы не хочам вайны супраць усяго НАТА, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Але калі яны гэта зробяць і на гэта пойдуць, ну што ж... У нас іншага выйсця не будзе. І ніякіх «чырвоных ліній» не будзе. Гэтая лінія — дзяржаўная граніца. Як толькі наступілі на яе (кажу як пагранічнік), адказ будзе імгненны».

### «Мы адкажам імгненна і адэкватна»

Адказваючы на пытанне, ці гатовы беларускі лідар націснуць «чырвоную кнопку», Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што «чырвоныя кнопкі» ўжо ўсе вакол панаціскалі. «Па перыметры Беларусі і Расіі ўжо панаціскалі «чырвоныя гэтыя кнопкі», — канкрэтызаваў ён. — Засталося толькі «самую чырвоную» націснуць. Таму ў маральных адносінах, напэўна, нам з Пуціным, прымаючы такія рашэнні, дык нават ужо неяк і няёмка аб гэтым гаварыць. Калі тут з'явілася тактычная ядзерная зброя, я ім (апанентам за мяжой. — **«Зв».**) прама сказаў: «Мы не збіраемся ніякай зброі прымяняць, пакуль вы не наступіце на нашу дзяржаўную граніцу». Яна ж — граніца нашай Саюзнай дзяржавы. Расія, па нашым дагаворы, уводзіць свае падраздзяленні (яны вызначаныя, якія арміі) у Беларусь. Мы прымаем першы ўдар, а далей у рэзерве нас падстрахоўвае Расія. Гэта агульная — Беларусі і Расіі — вайна супраць гэтых звяроў. І што, мы павінны чакаць, пакуль яны, як 85 гадоў таму, растопчуць нашу краіну, як гэта было з Савецкім Саюзам? Не! Таму мы адкажам імгненна і адэкватна».

Калі на Захадзе хочуць, каб гэтага не было, Прэзідэнт чарговы раз прапаноўвае сесці за стол перагавораў і скончыць гэту бойку. «Яна ні ўкраінскаму народу, ні расіянам, ні беларусам не патрэбна, — акцэнтаваў увагу ён. — Яна патрэбна ім. Я не магу прывесці гэтыя факты, яны абсалютна закрытыя, дзе яны ў адкрытую кажуць (высокапастаўленыя людзі): «Няхай б'юць адзін аднаго — украінцы, рускія — няхай у гэтым катле ўсе здохнуць». Гэта высокапастаўленыя асобы аб гэтым кажуць! Яны хочуць, каб мы адзін аднаго знішчылі».

### «Мы саюзнікі — гэтым усё сказана»

Адно з пытанняў датычылася таго, як беларускі лідар ацэньвае цяперашні этап развіцця Саюзнай дзяржавы, наколькі, па яго меркаванні, інтэграцыя трывалая і непарушная і што яшчэ трэба зрабіць для ўзмацнення саюза. «Магу сказаць проста: вам трэба ў Расіі і нам у Беларусі ісці па шляху двух прэзідэнтаў, — парэкамендаваў Аляксандр Лукашэнка. — Вы бачыце нашы адносіны — абсалютна блізкія. У прэзідэнта Пуціна ні з кім няма такіх адносін, як з Беларуссю. Гэта натуральна. Тут нічога не трэба прыдумляць, ніякай канспіралогіі. Мы саюзнікі — гэтым усё сказана».

Па словах кіраўніка дзяржавы, у аснове такога шчыльнага супрацоўніцтва ляжыць падабенства двух народаў, якія практычна нічым не адрозніваюцца адзін ад аднаго. «Як некаторыя гавораць, мы рускія людзі, — кажа беларускі лідар. — Чым мы адрозніваемся — беларусы ад рускіх? Нічым. Я некалі жартам гаварыў: беларусы — гэта тыя ж рускія са знакам якасці».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў гісторыі беларуска-расійскага супрацоўніцтва былі розныя перыяды, у тым ліку няпростыя. Але, нягледзячы на гэта, Прэзідэнт Беларусі ўсё роўна разам са сваімі калегамі трымаўся той палітыкі, якая праводзіцца цяпер.

Па словах кіраўніка дзяржавы, былі і пэўныя рознагалоссі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. «Я яму казаў: «Ведаеш, мы можам сварыцца колькі заўгодна, але мы павінны бачыць інтарэсы ўласнага народа, па-першае, — нагадаў беларускі лідар. — Па-другое, прыйдзе час, калі будзем стаяць спінай да спіны і адстрэльвацца ўдвух. Ох, як нас РТР і ўсе каналы (расійскія. — **«Зв»**.) тады крытыкавалі».

Многія, у тым ліку ваенныя, тады былі перакананы, што такія часы, калі давядзецца стаяць спінай да спіны і адстрэльвацца, ніколі не наступяць. «Аказалася, стаім спінай да спіны», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы і нагадаў, што з пачаткам СВА сказаў, што мы не дазволім рускім у спіну страляць. — Мы тады паднялі практычна паўарміі, закрылі той напрамак. Яны зразумелі, што жарты ў гэтым плане дрэнныя. Таму, вось, стаім. Часам спінай, часам адзін на аднаго гледзячы, і змагаемся супраць гэтых цынікаў».

**Вераніка КАНЮТА.**

### ❍ У тэму

Пасля інтэрв'ю з Прэзідэнтам Беларусі Яўген Папоў падзяліўся сваімі ўражаннямі ад размовы з беларускім лідарам. Па словах журналіста, гутарка была вельмі грунтоўнай і канкрэтнай, узважаны падыход Аляксандра Лукашэнкі ўразіў інтэрв'юера».

Яўген Папоў звярнуў увагу на тое, што, да гонару боку, які прымаў, ніякіх папярэдніх умоў для правядзення інтэрв'ю не было, тэмы і пытанні, якія планаваў агучыць журналіст, загадзя не абмяркоўваліся. «Зразумела, што ваш Прэзідэнт паглыблены ў сітуацыю, як ніхто, — падкрэсліў ён. — Я задаў тыя пытанні, якія цікавілі мяне як рэпарцёра, журналіста, і Аляксандр Рыгоравіч, як мне здаецца, быў вельмі адкрыты. Гэта вялікі поспех, і я за гэта ўдзячны».

Па словах вядучага грамадска-палітычнага ток-шоу, пазіцыя беларускага лідара запатрабавана ў расійскай аўдыторыі. «Яна не проста цікавая, а мае вельмі важнае значэнне, — удакладніў ён. — Гэта пазіцыя Беларусі, як адзначыў Аляксандр Рыгоравіч, — спіна да спіны. «Не чакайце, адсюль ніколі не будзе пагрозы», — гэта ключавое. І з пункту гледжання чалавечых адносін тут даўно, мне здаецца, трэба перастаць быць схільным да нейкіх наратываў з нагоды таго, што нас спрабуюць пасварыць, раз'яднаць ці нешта яшчэ зрабіць».

---

Сталічны час

## Наталля КАЧАНАВА: «САМАЗАСПАКАЕННЯ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА»

### На пасяджэнні Мінгарвыканкама падвялі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця сталіцы за паўгоддзе

**У рабоце пасяджэння ўдзельнічалі Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА, кіраўнікі і прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў горада.**

Ва ўступным слове першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ зазначыла, што асноўныя фінансавыя паказчыкі арганізацый горада маюць станоўчыя характарыстыкі. Мінгарвыканкамам і рэгулятарамі забяспечана стабільнае, паступальнае і дынамічнае сацыяльна-эканамічнае развіццё сталіцы. Горад займае лідзіруючыя пазіцыі ў фарміраванні валавога ўнутранага прадукту, забяспечваючы амаль трэць агульнарэспубліканскага аб'ёму.

Больш падрабязна пра эканамічны складнік праінфармаваў старшыня камітэта эканомікі Аляксандр ЯЎСЕЕЎ. Ён падкрэсліў, што валавы рэгіянальны прадукт Мінска, як асноўны паказчык, які характарызуе работу эканомікі горада, склаўся ў аб'ёме 36,6 млрд рублёў, тэмп росту — 104,7 %. Найбольшы прырост забяспечаны ў гандлі, (111,2 %), апрацоўчай прамысловасці (110,9 %), будаўніцтве (109,1 %), транспартнай дзейнасці (106,2 %), а таксама ў галіне аказання паслуг па часовым пражыванні і харчаванні (114,9 %).

Адным з асноўных драйвераў эканамічнага развіцця сталіцы ён назваў прамысловасць, якая не адзін год запар паказвае ўстойлівы рост. Так, аб'ём прамысловай вытворчасці павялічыўся на 8,1 % у фактычных цэнах, індэкс прамысловай вытворчасці ў супастаўных умовах склаў 107,9 %. Такім чынам, Мінск за няпоўныя чатыры гады ўжо забяспечыў выкананне паказчыка пяцігодкі. Дасягнуць такіх поспехаў удалося і за кошт укаранення інавацый, вытворчасці высокатэхналагічных тавараў, у тым ліку імпартазамяшчальных, пашырэння тэхнапаркаў. У агульным аб'ёме адгружанай прамысловай прадукцыі 28,9 % складае інавацыйная прадукцыя, і па гэтым паказчыку сталіца займае лідзіруючыя пазіцыі сярод рэгіёнаў краіны.



Фота БелТА.

Старшыня камітэта эканомікі адзначыў, што ў цэлым у Мінску захоўваецца сацыяльна-эканамічная стабільнасць. Прадпрыемствы горада завяршылі першае паўгоддзе, паказаўшы эфектыўную работу: выручка ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ, паслуг вырасла на 15,8 %, чысты прыбытак вырас на 15,1 % і склаў 3,6 млрд рублёў. Сукупныя паступленні даходаў бюджэту г. Мінска выраслі на 16,3 %. Дзякуючы ўстойліваму развіццю эканомікі, на 18,9 % павялічылася намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў сталічных арганізацый. Гэта самы высокі ўзровень зарплаты сярод рэгіёнаў краіны — 2905,1 рубля. Тэмп росту рэальнай заработнай платы склаў 112,5 %.

Гаворачы пра экспарт тавараў і паслуг, Аляксандр Яўсееў зазначыў, што асноўныя пункты росту ў гэтым — дыверсіфікацыя, асваенне новых рынкаў збыту, нарошчванне прысутнасці ў Расійскай Федэрацыі, Кітаі, краінах Азіі і Афрыкі. Асобна ён падкрэсліў неабходнасць больш актыўнага ўзаемадзеяння з рэгіёнамі Расіі, якая на сёння з'яўляецца асноўнай краінай — імпарцёрам беларускай прадукцыі. У цэлым жа за разгледжаны перыяд экспарт тавараў і паслуг склаў 7,1 млрд долараў ЗША.

Яшчэ адзін, акрамя экспарту, найважнейшы кірунак эканамічнай дзейнасці — інвестыцыі. Сёння апераджальнымі тэмпамі праводзіцца мадэрнізацыя прадпрыемстваў, растуць укладанні ў актыўную частку асноўных сродкаў. Па затратах на набыццё машын, абсталявання, транспартных сродкаў забяспечаны тэмп росту 130,7 % (1,6 млрд рублёў). У цэлым за паўгода сталічныя арганізацыі асвоілі 3,6 млрд рублёў інвестыцый у асноўны капітал з тэмпам росту 118,1 %. Палова з іх (1,8 млрд рублёў) прыпадае на будаўніча-мантажныя работы, тэмп росту — 111,0 %. Як заўважыў старшыня камітэта эканомікі, Мінск па-ранейшаму прывабны для замежных інвестараў: сёлета ў эканоміку горада паступіла ўжо 817,4 млн долараў ЗША прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове.

Спыніўся ён і на развіцці спажывецкага рынку сталіцы, які характарызуецца задавальненнем попыту насельніцтва на харчовыя і нехарчовыя тавары. Па выніках паўгоддзя рознічны тавараабарот склаўся з тэмпам росту 119,8 % (13,8 млрд рублёў), аптовы — 107,4 % (46,2 млрд рублёў), тавараабарот грамадскага харчавання — 115,1 % (1,4 млрд рублёў).

Закрануў Аляксандр Яўсееў і тэму жыллёвага будаўніцтва і капрамонтаў. Так, за студзень—чэрвень у эксплуатацыю ўведзена 240 тыс. кв. метраў жылля, пасля капітальнага рамонту ўведзена 282,8 тыс. кв. метраў жыллёвага фонду.

Жыллёвую тэму працягнуў намеснік старшыні камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Дзяніс НІКІЦІН. Ён акцэнтаваў увагу ўдзельнікаў пасяджэння на тым, што ў горадзе асноўны ўпор зроблены на будаўніцтва арэнднага жылля, а таксама жылля для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На гэты год па жыллёвым будаўніцтве Мінску даведзена заданне ў аб'ёме 690 тыс. кв. метраў. З іх — 650 тыс. кв. метраў непасрэдна ў сталіцы і 40 тыс. кв. метраў у Мінскай вобласці: у Смалявічах і пасёлку Сонечны. Намеснік старшыні камітэта запэўніў прысутных у тым, што да канца бягучага года запланавана выкананне паказчыкаў у поўным аб'ёме па ўводзе ў эксплуатацыю жылля.

Каментуючы даклады, Наталля Качанава заўважыла, што, нягледзячы на станоўчыя вынікі і выкананне прагнозных паказчыкаў, самазаспакаення быць не павінна. Бо гэтыя вынікі — толькі шэсць месяцаў, і ўжо сёння трэба пралічваць, з чым сталіца прыйдзе да канца года. У прыватнасці, яна засяродзіла ўвагу ўдзельнікаў пасяджэння на тэрмінах рэалізацыі інвестпраектаў.

— Інвестпраекты. Я звяртаю самую сур'ёзную ўвагу кіраўнікоў адміністрацый: гэтае пытанне разглядалася на пасяджэнні Савета Міністраў, дзе дакладна была пастаўлена задача па інвестыцыях і па рэалізацыі інвестпраектаў. Таму ніякага адставання быць не павінна, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі і дадала, што трэба смялей прыцягваць інвестыцыі і інвестараў у горад.

Таксама спікер агучыла тэму павелічэння колькасці імпартных тавараў у гандлёвых сетках Мінска. Па яе словах, такое засілле недапушчальна. І гэта недапрацоўка гандлёвай галіны. Наталля Качанава падкрэсліла, што менавіта асартымент айчынных тавараў у гандлёвых пунктах павінен быць на пастаянным кантролі гарадскіх улад і рэгулятараў.

Асобна яна спынілася на рабоце са зваротамі грамадзян.

— Мы праводзім прыёмы па асабістых пытаннях. У кожнага з вас ёсць графік іх правядзення. Ёсць Закон аб зваротах грамадзян, Прэзідэнт правёў нараду па гэтым пытанні. На гэтыя звароты неабходна рэагаваць. Выязджайце і разбірайцеся — трэба смела ісці да людзей, тлумачыць, — адзначыла Наталля Качанава.

Яшчэ адно пытанне, якое патрабуе асаблівай увагі, — парадак у сталіцы. Тут павінен быць ідэальны парадак: фасады, рэклама, падсветка, азеляненне, своечасовая прыборка. І не толькі на цэнтральных вуліцах. Гэтым прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы павінны займацца самастойна. Як і грамадскія арганізацыі. Толькі разам, па словах Наталлі Качанавай, можна дасягнуць па-сапраўднаму добрых вынікаў, бо наша сіла ў адзінстве.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**

У фармаце дыялогу

# Разумная вытворчасць і выклікі ў сеціве

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля ПЯТКЕВІЧ азнаёмілася з вытворчасцю кобрынскага СТАА «ПП Палессе» і сустрэлася з працоўным калектывам прадпрыемства**



Фота Брэсцкага аблвыканкама

Сёння «Палессе» — адзін з найбуйнейшых у Еўропе вытворцаў дзіцячых цацак з пластмасы і адначасова горадаўтваральнае прадпрыемства Кобрына, тут працуюць тысячы людзей. Прадукцыю кабрынчане рэалізоўваюць на ўнутраным рынку, пастаўляюць у краіны блізкага і далёкага замежжа.

Наталля Пяткевіч наведала зборачна-ўпаковачны цэх, пазнаёмілася з прадукцыяй кампаніі, пагаварыла з работнікамі. Першаму намесніку кіраўніка Адміністрацыі прадставілі інвестпраект, у выніку рэалізацыі якога нядаўна з'явіўся новы завод, які ўзвялі за паўтара года. Дырэктар кампаніі Андрэй Гольцман паведаміў, што новая пляцоўка дазволіць нарасціць вытворчасць на 30—40 працэнтаў. Наталля Пяткевіч пабывала на новай пляцоўцы.

У размове з працаўнікамі «Палесся» Наталля Пяткевіч адзначыла высокі інтэлектуальны ўзровень вытворчасці, у ліку дасягненняў адзначыла высокатэхналагічную, разумную сістэму вытворчасці, што робіць магчымым назваць кобрынскае прадпрыемства вытворцам сусветнага ўзроўню.

Падчас сустрэчы з працаўнікамі гаворка зайшла аб інфармацыйнай гігіене, гаварылі найбольш аб тым, як не стаць ахвярай дэзынфармацыі. «Інтэрнэт стаў часткай нашага жыцця. Мы вучымся, працуем, купляем, чытаем навіны, парады, рэцэпты, словам, жывём у абсалютна інфармацыйнай прасторы. І гэта добра, гэта дае неабмежаваныя магчымасці, з аднаго боку, — сказала Наталля Пяткевіч. — А з другога боку, гэта становіцца выклікам, які вымагае мець пэўную інфармацыйную культуру, вымагае ўмець карыстацца інфармацыяй і разбірацца ў інфармацыі. Бо яе надта многа».

Наталля Пяткевіч засяродзіла ўвагу аўдыторыі на тым, як важна крытычна ацэньваць інфармацыю, правяраць крыніцы інфармацыі і свае кантакты для стасункаў. «Варта лічыцца з тым, што наша жыццё ў інфармацыйнай прасторы ператварылася ў пагрозу нашай бяспецы. І карыстальнікі павінны ўмець прыстасоўвацца да такіх умоў. Асабліва важна навучыць дзяцей правілам паводзінаў у сеціве». А яшчэ прывяла цікавыя лічбы: «Беларусь займае 22 месца сярод 132 дзяржаў па даступнасці да інфармацыйна-камп'ютарных тэхналогій. І гэта надзвычай вялікі паказчык. Калі 10 гадоў таму інтэрнэтам карысталіся 5,7 мільёна чалавек, то цяпер — 90 працэнтаў насельніцтва».

На сустрэчы таксама ўзнімаліся актуальныя для Кобрыншчыны пытанні, гаварылі пра значэнне Дня народнага адзінства. І адразу нарадзілася ініцыятыва — перадаць 17 верасня партыю цацак з «Палесся» дзецям з сямей, якія пераехалі ў Беларусь з Данбаса.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЧАЦВЁРТЫМ УКОСАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Нормай для нас з'яўляецца паўтарагадовы запас кармоў, — сказаў карэспандэнту газеты **дырэктар «Беражнога» Віталь ЯХНАВЕЦ.** — Пакуль што кормім пагалоўе тым, што нарыхтоўвалі ў мінулым годзе. Восенню адкрыем першыя сіласныя ямы гэтага года. Працэс нарыхтоўкі кармоў выходзіць на фінальную стадыю. Фактычна работы па трэцім укосе ў нас — на дзень-два. Застануцца яшчэ невялікія ўчасткі люцэрны, дзе можна будзе зняць і чацвёрты ўкос. А потым, восенню, калі надвор'е паспрыяе і на нейкіх палях падымуцца травы, магчымым будзе і чацвёрты ўкос. Але гаворка ідзе пра невялікія ўчасткі, мы ўзялі за звычку не пакідаць ніводнага лапіка з травой непрыбраным, зімой як знойдзеш тую тону корму.

Працягваецца ўборачная кампанія на травяных палетках ААТ «Ставокскае» Пінскага раёна. У гаспадарцы робяць упор на жывёлагадоўлю. Атрымлівацца жа прывагі і надоі можна толькі пры дастатковай колькасці кармоў. Варта сказаць, што «Ставокскае» — сельгаспрадпрыемства, якое інтэнсіўна развіваецца. За апошнія 12 гадоў валавая вытворчасць малака ўзрасла больш чым у тры разы. Удой ад каровы павялічылі амаль удвая. Ды і пагалоўе вырасла больш чым у два разы. Адсюль і патрэба ў кармах. Напрыклад, летась у гаспадарцы нарыхтавалі 42,7 цэнтнера кармавых адзінак кармоў (з улікам кукурузы) на ўмоўную галаву жывёлы. Гэта быў другі вынік па вобласці.

— Цяпер таксама працягваецца работа па нарыхтоўцы кармоў, — гаворыць **намеснік дырэктара ААТ «Ставокскае» Аляксандр КАРАВАЕВІЧ.** — Травы выраслі добрыя. На розных участках бяром ад 50 да 100 цэнтнераў з гектара. 23 тысячы тон збожжасенажу нарыхтавалі з першых двух укосаў траў. Набірае абароты трэці ўкос бабова-злакавых і збожжавых культур. А пасля ўборкі кукурузы недзе ў канцы верасня — пачатку кастрычніка пачнём чацвёрты ўкос. У планах — перакрыць леташні паказчык і нарыхтаваць каля 45 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву.

На нарыхтоўцы кармоў працуюць вопытныя трактарысты. Напрыклад, Віталь Лазюк травы ўбірае восьмы сезон. Працаўнік добры, ды і тэхніка не падводзіць. Не адстае ад яго і таварыш Андрэй Ціханчук.

За такімі працаўнікамі правяраць не трэба, зробяць акуратна, якасна, нават пракос за імі застаецца прыгожы, — каментуе Аляксандр Фёдаравіч.

Як паведаміла карэспандэнту газеты начальнік аддзела вытворчасці прадукцыі раслінагадоўлі і кормавытворчасці камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканканкама Аксана Лашкевіч, гаспадаркі рэгіёна паўсюль вядуць трэці і чацвёрты ўкос траў. Чацвёрты ўкос бярэцца з палеткаў травасумесяў, люцэрны. А некаторыя сельгаспрадпрыемствы, дарэчы, пачалі выбарачна ўбіраць кукурузу.

Што датычыць травяных кармоў, іх па вобласці нарыхтавана 12,3 цэнтнера кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы, што на 1,1 цэнтнера пераўзыходзіць паказчык мінулага года. Закладзена на захоўванне 789,2 тысячы тон кармоў, што складае 107 працэнтаў ад мінулагодняга.

Ёсць усе падставы спадзявацца, што сельгаспрадпрыемствы паспяхова справяцца з пастаўленай задачай па нарыхтоўцы кармоў, — заключыла Аксана Лашкевіч.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота БелТА.

Аб медыцыне і не толькі

# Выхоўваць гуманізм і патрыятызм



Лета — той час, калі ўсім нашым школьнікам, якія стаміліся падчас навучальнага года, неабходна аздараўленне. Калі ёсць магчымасць адправіць дзіця ў вёску — трэба ёй карыстацца. Тым больш што сёння многія беларускія вёскі — візітоўка Беларусі: зялёныя, прыгожыя, з добрай транспартнай і прадуктовай даступнасцю, прыгожымі краявідамі.

Калі такой магчымасці няма ці дзіця па стане здароўя мае неабходнасць у аздараўленні, ёсць санаторыі, дамы адпачынку санаторнага тыпу, аздараўленчыя лагеры, каб дзеці адпачылі тэматычна. Ненавязлівыя заняткі «25 кадрам» падчас такога адпачынку — гэта таксама карысна, а галоўнае — дзеці занятыя.

Калісьці пра нас старэйшае пакаленне казала, што дзеці бегаюць беспрытульнікамі, пакуль бацькі на працы. У маім дзяцінстве так і адбывалася. Раніцай прачнуўся, хуценька паснедаў і — на вуліцу, і толькі ўвечары цябе знайшлі бацькі: бруднага, падрапанага, галоднага, але шчаслівага. Аднак тады, напэўна, у гэтым была свая карысць, асабліва для здароўя. Я быў худы, але мог, як той казаў, абагнаць матацыкл.

Цяпер, калі пакінуць дзіця дома, яно возьме хот-дог, чыпсы і сядзе за камп'ютар ці тэлефон — і так прасядзіць увесь дзень, пакуль бацькі не прыйдуць з работы. Гэта абсалютная шкода, бо дзіця не адпачывае. Галаўны мозг увесь час працуе, прычым на высокіх хуткасцях. Змена карцінак, сцэнарыяў узбуджае кару галаўнога мозга, напружвае зрок. Дзіця няправільна сядзіць, есць такую дрэнь, што лепш бы яно нічога не ела, а дачакалася маці і нармальна павячэрала.

Усё гэта вядзе да вядомай сумнай тэндэнцыі: у многіх дзяцей псуецца зрок, агульная фізічная падрыхтоўка, яны назапашваюць фактары рызыкі развіцця хранічных хвароб, якія літаральна ў 30 гадоў да іх пастукаюцца. А да 40 гадоў фактараў рызыкі неінфекцыйных хвароб (на якія, дарэчы, мы можам уплываць) будзе больш чым дастаткова, каб стартавала нават не адна, а 4-5 хранічных хвароб. Гэта і цукровы дыябет, і праблемы з суставамі, артэрыяльным ціскам, памяццю, атлусценне. І віна таму — гіпадынамія.

Аздараўленчыя лагеры вырашаюць у тым ліку і гэту задачу: дзеці занятыя, у тым ліку тэматычна. Да спартыўных заняткаў і вялікай колькасці іншых актыўнасцяў на свежым паветры дадаецца карысная веды, патрыятызм, гісторыя і сучаснасць Беларусі — тое, што павінен ведаць будучы грамадзянін і дастойны прадстаўнік сваёй краіны.

Выдатна, што ў нашай краіне захавана і пастаянна ўдасканальваецца сетка дзіцячых аздараўленчых устаноў. Як і тое, што дзяржава бярэ на сябе фінансаванне дзіцячай аздараўленчай кампаніі, суфінансаванне саміх аздараўленчых лагераў, часта на сваім балансе іх трымаюць дзяржпрадпрыемствы. Дапамагаюць і грамадскія аб'яднанні — праводзяць тэматычныя дні, арганізоўваюць святы, каб дзеці больш даведваліся і пра самі аб'яднанні, і пра тыя задачы, якімі яны займаюцца.

У прыватнасці, Чырвоны Крыж, як найбуйнейшая гуманітарная арганізацыя ў краіне, арганізоўвае ў дзіцячых аздараўленчых лагерах тэматычныя дні. Мы расказваем аб рабоце нашай арганізацыі, аб руху Чырвонага Крыжа, міжнародным гуманітарным праве. Дзеці даведваюцца, чым займаецца Чырвоны Крыж, як і каму ён дапамагае і наколькі гэта важна — дапамагаць. Сярод атрымальнікаў дапамогі — дзеці-інваліды, інваліды, адзінокія грамадзяне, пажылыя людзі і тыя, хто тут і цяпер трапіў у складаную жыццёвую сітуацыю. Надзвычай важна вучыць гэтаму нашых дзяцей: калі бачыце, што хтосьці мае патрэбу ў дапамозе, — дапамажыце: гэта добры, правільны ўчынак, які ва ўсе часы ўзводзіўся ў ранг дабрадзейнасці.

Акрамя таго, мы вучым дзяцей асновам аказання першай дапамогі, у тым ліку з адпрацоўкай практычных навыкаў. Гэта веды, якія могуць спатрэбіцца кожнаму на працягу ўсяго жыцця, таму важна, каб чалавек яшчэ ў дзяцінстве ці падлеткавым узросце ўсвядоміў: калі побач здарылася бяда, няхай ён і не зможа аказаць неабходную першую дапамогу ў поўным аб'ёме, але ведае, якія дзеянні і ў якім парадку трэба зрабіць, куды патэлефанаваць, і гэтыя рэчы аблегчаць пакуты чалавека, а магчыма, выратуюць і жыццё.

Дадаткова мы расказваем дзецям, як працуюць нашы каманды хуткага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі. Каманды створаны ў кожнай вобласці, праходзяць падрыхтоўку і спецыяльнае навучанне сумесна з ратавальнікамі і інструктарамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. І мы як партнёры дапамагаем у ліквідацыі наступстваў розных сітуацый прыроднага, тэхнагеннага характару. У дзяцей вялікую цікавасць выклікае экіпіроўка, абсталяванне каманд.

Праз некалькі гадоў, калі гэтыя дзеці стануць старэйшымі школьнікамі ці студэнтамі і ўбачаць на вуліцы акцыю Чырвонага Крыжа, яны будуць ведаць, што гэта за арганізацыя, а магчыма, і самі стануць валанцёрамі. Іншыя грамадскія арганізацыі, той жа Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, таксама такім чынам займаецца з дзецьмі. А апошнія, стаўшы паўнапраўнымі грамадзянамі, будуць ведаць, чым жыве грамадзянская супольнасць.

Адна справа — бачыць па тэлебачанні ці чуць ад педагогаў, іншая — непасрэдна кантактаваць з прадстаўнікамі грамадскіх аб'яднанняў і разумець, якой важнай місіяй яны займаюцца. У будучыні, калі маладога чалавека паклічуць у Беларускі саюз моладзі ці Чырвоны Крыж, ён не будзе думаць, навошта гэта трэба, бо ведае, што гэта добрая каманда, цікавыя людзі і ідэі. Такім чынам, мы выхоўваем сярод нашага будучага пакалення гуманізм і патрыятызм. Гэта два складнікі поспеху цывілізаванага развіцця любога грамадства. І тым, што робіцца ў нашай краіне ў гэтым кірунку, мы можам ганарыцца.

**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў, генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа.**

# ДАКРАНУЦЦА ДА РОДНАЙ ГІСТОРЫІ



## Еўрапейскі горад і старажытнасць

Назіраючы за жыццём гарадскога асяроддзя, можна заўважыць, што вялікіх турыстычных аўтобусаў паменшала. Але ці стала менш турыстаў? Як сведчыць статыстыка, у Гродзенскай вобласці з 2021 года іх колькасць застаецца амаль што на адным узроўні. Напрыклад, летась рэгіён наведалі каля 450 тысяч турыстаў, з іх замежнікаў 81,5 тысячы чалавек. Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Таццяны ЛІДЗЯЕВАЙ,** у рамках бязвізавага ўезду тут пабывала 17 тысяч грамадзян Літвы, Латвіі і Польшчы. Можна сказаць, што кожны пяты замежны турыст — з Еўрасаюза. Між тым апошнім часам, заўважае спецыяліст, назіраецца рост папулярнасці менавіта ўнутранага турызму і павялічваецца попыт на падарожжа па Беларусі прадстаўнікоў Расіі і краін СНД. Пры гэтым большасць гасцей аддае перавагу асабістаму транспарту.

Вось і Валерыя з малодшай сястрой прыехалі з Санкт-Пецярбурга на ўласным аўтамабілі. Многія іх сябры пасля паездкі ў Беларусь раілі абавязкова тут пабываць. Таму свой адпачынак і канікулы дзяўчаты вырашылі прысвяціць знаёмству з краінай-суседкай. У Беларусі яны першы раз і ўжо паспелі пабываць у Мінску, Гомелі, Брэсце.







А ў Гродне мы сустрэліся каля самай старой драўлянай пабудовы Беларусі — старога лямуса. Аб існаванні ўнікальнага аб'екта яны даведаліся з мясцовага турыстычнага сайта. Па ўсім было відаць, што пабудова вельмі ўразіла расійскіх падарожнікаў, асабліва тое, што ўзвялі яе ў XVIII стагоддзі без адзінага цвіка. Сёстрам пашанцавала: зусім нядаўна тут адкрылі музей гаспадарчых прылад і побыту. Увогуле горад уразіў іх мноствам гістарычных аб'ектаў. Па словах Валерыі, тут адчуваецца спалучэнне сучаснага еўрапейскага горада і старажытнасці.

## Раскошныя палацы і рэшткі Фары Вітаўта

Значная катэгорыя ўнутраных турыстаў — сямейнікі. Як правіла, яны выязджаюць індывідуальна з дзецьмі падчас канікул і адпачынку альбо на ўікэнд. Яўген Эрдман з жонкай Аксанай і дачкой Машай жывуць у Лідзе Гродзенскай вобласці. Мы сустрэліся ў Гродне амаль перад іх ад'ездам. Яны расказалі, што пабывалі на Аўгустоўскім канале, наведалі нядаўна адкрыты пасля рэстаўрацыі былы палац Валовічаў у Свяцку, па дарозе агледзелі ваенныя доты, зацікавіліся і драўляным лямусам. Прыцягнуў увагу той факт, што тут знаходзіліся каменныя рэшткі старажытнага гродзенскага храма XIV стагоддзя так званай Фары Вітаўта. На жаль, храм не захаваўся.

Увогуле вандраваць па Беларусі стала для сям'і чымсьці накшталт традыцыі. Выязджаюць не толькі падчас адпачынку, але і на выхадных. Дыяпазон інтарэсаў шырокі: як агляд славутасцяў, так і тэматычныя экскурсіі. Напрыклад, тыдзень таму ездзілі ў Гомель з абавязковым наведваннем палаца Паскевічаў, а да гэтага былі на ферме па вырошчванні слімакоў у Карэліцкім раёне. Там, дарэчы, для турыстаў наладжана і дэгустацыя.

Вядома, зацікавіў фінансавы складнік такіх вандровак. Наколькі сярэднестатыстычная сям'я можа сабе дазволіць выехаць у іншы рэгіён на адзін-два дні? Безумоўна, расходы будуць, згаджаецца Аксана, але пры правільным падыходзе ёсць магчымасць значнай эканоміі. Так, жыллё на суткі можна знайсці ў межах 70—100 рублёў, а перакус прыгатаваць самастойна. Многія музеі прапануюць зніжкі для сем'яў, ёсць сямейныя экскурсійныя праграмы. Па словах Яўгена, яны шукаюць менавіта незвычайныя аб'екты, якія не вельмі на слыху, малавядомыя, але ўнікальныя.

— У Беларусі нямала такіх таямнічых і цікавых месцаў, будынкаў, помнікаў прыроды. Аб гэтым усё больш расказваюць і блогеры-вандроўнікі. Мы і самі шукаем такія мясціны. Нядаўна пабывалі ў Ліпічанскай пушчы — прыгожым ландшафтным заказніку. Хочацца як мага больш даведацца аб сваёй краіне, убачыць на свае вочы тое багацце, якое захавалася з даўніх часоў, — расказала Аксана.

Яна дадала, што іх прыклад стаў штуршком для іншых сем'яў. Цяпер і сябры пачалі вандраваць, што зрабіла іх зносіны больш змястоўнымі. Пры сустрэчах ёсць чым падзяліцца, расказаць аб уражаннях.

Пазнавальны турызм у трэндзе і ў сям'і Арцюшкевічаў з Мінска. Цікава, што ў падарожжа адпраўляюцца адразу тры пакаленні сямейнікаў, таму набіраецца нават невялікая турыстычная група. Яны неаднойчы бывалі ў Гродне, але кожны раз знаходзяць новыя аб'екты для наведвання. Напрыклад, цікавасць выклікаў Стары каралеўскі замак, дзе летась завяршыўся маштабны этап рэканструкцыі музейнага комплексу. Госці з Мінска агледзелі пышныя каралеўскія пакоі, экспанаты XII стагоддзя, вялізную інтэрактыўную карту старажытнага горада ў 3D-праекцыі.

Іх прыемна ўразілі зніжкі, якія прадугледжаны для сем'яў і пенсіянераў. А яшчэ мінчанам спадабаўся пешы праменад па гістарычным цэнтры ў вячэрні час. «Мы былі тут з экскурсіяй некалькі гадоў таму, але цяпер больш звярнем увагу на дэталі, асаблівасці. Заўважаем новыя кафэ, сувенірныя лаўкі, культурныя аб'екты. Бачым, што ў горадзе з'явілася кола агляду, прыгожая пляцоўка-кафэ на даху ЦУМа. Пры жаданні можна вельмі добра адпачыць», — кажа Святлана Арцюшкевіч. Пры гэтым выдаткі на пражыванне не патрэбны — яны могуць спыніцца ў сваякоў.

Аб папулярнасці культурна-пазнавальнага турызму сведчыць і рэкордная колькасць наведвальнікаў Старога замка. Толькі за ліпень тут пабывалі больш за 25 тысяч чалавек. Экскурсіі выхаднога дня на жнівень і верасень ужо распісаны. Па словах супрацоўнікаў гісторыка-археалагічнага музея, з пачатку года тут з'явілася новая паслуга — фотасесія ў інтэр'еры XI—XIX стагоддзяў. Для груп таксама ёсць майстар-класы па вырабе старажытных гравюр.

Дарэчы, Стары замак у Гродне з'яўляецца ўнікальным помнікам архітэктуры і археалогіі Беларусі. Ужо ў XII стагоддзі горад стаў цэнтрам княства, у XIV-м на Замкавай гары была ўзведзена велікакняжацкая рэзідэнцыя, а пазней — і каралеўскі палац.

Рэканструкцыя комплексу працягваецца: на чарзе работы па аднаўленні былога каралеўскага палаца і дваровай тэрыторыі.

## «Успаміны ўздымаюць настрой»

Згодна з апошнім даследаваннем Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, больш за 90 працэнтаў апытаных беларусаў для адпачынку выбіраюць сваю краіну. У тройцы самых папулярных гарадоў — Мінск, Брэст і Гродна. Пераважная большасць рэспандэнтаў альбо выязджала сёлета на адпачынак, альбо збіраецца гэта зрабіць. Пры гэтым трэцяя частка апытаных вандруе па Беларусі некалькі разоў на год, кожны чацвёрты робіць гэта адзін раз на год. Праўда, нямала і тых, хто наогул нікуды не выязджае. Іх колькасць складае амаль 30 працэнтаў удзельнікаў апытання. Між тым многія маюць жаданне асвоіць такі від адпачынку. Тут, як кажуць, справа часу.

Да нядаўняга ў гэтай кагорце была і сям'я Лагуновых з Мінска. Дзмітрый з жонкай Наталляй і дачкой Верай сёлета ўпершыню разам выехалі ў падарожжа па Беларусі. Мы сустрэліся ў гістарычнай частцы Гродна ў другі дзень пасля іх прыезду. Спыніліся яны на турыстычнай базе, дзе знялі нумар «люкс» за 100 рублёў у суткі.

Наталля паведаміла, што па дарозе сюды заехалі ў Лідскі замак, пабывалі на мелавых азёрах каля Гродна, якія вельмі ўразілі. У абласным цэнтры наведалі славутую Каложскую царкву XII стагоддзя, старажытны манетны двор, замкавы комплекс. «Чаму ўзнікла жаданне праехаць па Беларусі?» — пытаюся ў Наталлі.

— Хочам зацікавіць дачку, каб яна захапілася роднай гісторыяй, мы бачым, якая багатая ў нас спадчына, якія цікавыя гісторыка-культурныя аб'екты ёсць у краіне. Трэба вывучаць сваю гісторыю. Мы плануем яшчэ пабываць у Гомелі, заедзем у Слонім да сына, дзе ён служыць,— расказала суразмоўніца.

Першы сямейны выезд паказаў, наколькі гэта захапляльна. Таму Наталля ўпэўнена, што і надалей сям'я будзе шукаць магчымасць такіх вандровак.

— Трэба папаўняць уражанні, бо застаюцца вельмі прыемныя ўспаміны, якія станоўча ўплываюць на агульны настрой. Асабліва, калі можна падзяліцца са сваімі блізкімі і згадаць цікавыя моманты. Паездкі з турфірмай, магчыма, больш інфарматыўныя, але сапраўдны смак надае падарожжа з сям'ёй, — упэўнена жанчына.

Яна лічыць, што ў цэлым краіна падрыхтавана да прыёму турыстаў. Дастаткова і атэляў, і турыстычных баз, і аграсядзіб, дзе можна спыніцца. Галоўнае — браніраваць загадзя. Усё часцей сем'і заказваюць і паслугі экскурсавода. Попыт настолькі вялікі, што ў Гродне пачалі адчуваць дэфіцыт супрацоўнікаў. Як расказала Таццяна Лідзяева, ва ўпраўленне спорту і турызму пастаянна тэлефануюць з просьбамі выдзеліць экскурсавода. У вобласці цяпер налічваецца больш за 150 такога роду спецыялістаў, на пачатку верасня плануецца правядзенне атэстацыі яшчэ 16.

Дарэчы, Гродна стаіць на першым месцы, куды беларусы раяць адправіцца сваім сябрам і знаёмым. У топе таксама Нясвіж, Брэст, Мір, Браслаўскія азёры, Мінск, Нарач, Белавежская пушча і Віцебск. Такі рэйтынг складзены па выніках сацыялагічнага апытання. І хаця асноўнай крыніцай інфармацыі аб турыстычных аб'ектах з'яўляецца інтэрнэт, каля 30 працэнтаў беларусаў прыслухоўваюцца да рэкамендацый сваіх знаёмых і сваякоў.

Кожны другі падарожнік па Беларусі наведвае гістарычныя і культурныя месцы, многія з ліку апытаных аддаюць перавагу візітам на малую радзіму. Папулярны ў беларускай адпачынак у прыродным асяроддзі. Кожны пяты беларускі турыст актыўна цікавіцца падзейнымі мерапрыемствамі — святамі, фестывалямі, у тым ліку гістарычнымі рэканструкцыямі, кірмашамі, спартыўнымі спаборніцтвамі.

На Гродзеншчыне месцаў для размяшчэння падарожнікаў хапае, хоць іх і менш, чым у іншых абласцях. На 66 адпаведных аб'ектах могуць размясціцца 2,6 тысячы чалавек. Каб зацікавіць турыстаў і пашырыць турыстычны патэнцыял, летась праведзены работы на 25 аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны. Распрацавана больш за паўсотню новых турыстычных маршрутаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З нагоды

# «НОВЫЯ ЛЮДЗІ» — НОВЫЯ ПЕРАМОГІ

**Праграма «Новыя людзі» тэлеканала «Беларусь 3» стала найлепшай у намінацыі «Вечныя каштоўнасці» на VI Міжрэгіянальным гуманітарна-асветніцкім медыяфестывалі «Спас на Енісеі — 2024».**

Сёлетні шосты медыяфестываль праходзіў у Краснадары і стаў выдатнай пляцоўкай, на якой прадстаўнікі медыйнай супольнасці разам з экспертамі змаглі абмеркаваць многія актуальныя тэмы. Традыцыйна там таксама падводзілі вынікі творчага конкурсу журналісцкіх работ. Сёлета творчае спаборніцтва сабрала рэкордную колькасць заявак: у сямі намінацыях удзельнічала 986 работ з 24 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь.

Так, найлепшай у намінацыі «Вечныя каштоўнасці» (катэгорыя «Электронныя медыя») сярод 279 работ стала праграма «Новыя людзі. Пост № 1» тэлеканала «Беларусь 3». Выпуск перадачы прысвечаны юным хлопцам і дзяўчатам, што нясуць вахту Памяці на пасту № 1 у Брэсцкай крэпасці. Мастацкае адлюстраванне традыцыі, якой ужо шмат гадоў, атрымала найвышэйшую адзнаку прафесійнага журы.

Як адзначыла аўтар і рэжысёр праекта Надзея Габец, «галоўная задача праграмы «Новыя людзі» — паказаць, як фарміруецца асоба. Узрост герояў нашага праекта — ад 15 да 22 гадоў. Яны толькі пачынаюць свой шлях».

Нагадаем, усе выпускі перадачы «Новыя людзі» даступныя да прагляду на YouTube-канале «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**



# ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 224

**27 ліпеня адбыўся міжрэгіянальны турнір па шашках-64, прысвечаны 700-годдзю г. Мядзела. У спаборніцтвах прынялі ўдзел 22 шашысты. Перамог майстар Віталь Аніська, на другім месцы — Леанарда Пашкевіч, «бронза» ў Аляксандра Сачкоўскага.**

З 22 да 27 ліпеня ў г. Санкт-Пецярбург (Расія) праходзіў традыцыйны турнір па шашках-64 «Белыя ночы». У класічнай праграме Яўгенія Швед стала другой сярод жанчын. У маланкавай праграме «серабро» сярод мужчын на рахунку Арцёма Ціханава. У жаночым заліку п'едэстал аказаўся беларускім: Вікторыя Нікалаева першая, Марыя Тараніна другая, Яўгенія Швед трэцяя.

З 29 ліпеня да 2 жніўня пры падтрымцы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь праходзілі міжнародныя спаборніцтвы па шашках-64 «Орша Мастэрс». Сярод 36 удзельнікаў пяць міжнародных гросмайстраў і 13 майстроў. Перамог міжнародны гросмайстар Аляксей Куніца: 14 ачкоў з 18 магчымых. На другім месцы — дзеючая чэмпіёнка свету сярод жанчын Вікторыя Нікалаева, бронзавая ўзнагарода — у гросмайстра з Санкт-Пецярбурга Георгія Тараніна (у абодвух па 12 ачкоў). Тры шашысты — Д. Нікіценка, М. Акуловіч і Л. Шур выканалі норму майстра спорту. Самы юны ўдзельнік спаборніцтваў Іван Невар з Оршы, якому толькі 9 гадоў, выканаў норму кандыдата ў майстры спорту.



**№ 121.** Невар І. — Варушыла В.

**Белыя простыя:** c1, e1, g1, b2, h2, a3, e3, b4, h4, a5 (10)

**Чорныя простыя:** b6, f6, h6, c7, e7, g7, b8, d8, f8, h8 (10)

Ход чорных, яны маглі раставіць пастку 6...hg5 і на памылковы ход 7. ed4?, правесці камбінацыю. Адшукайце яе самастойна.

**№ 122** А. Сачкоўскі — У. Халдзей

**Белыя простыя:** a1, g1, h2, a3, e3, дамка b8 (6)

**Чорныя простыя:** f2, c5, b6, f6, h6, a7 (6)

У распараджэнні белых ёсць хуткі і прыгожы шлях да перамогі, пакажыце яго.

У шашкі-100 прапануюцца кампазіцыі міжнароднага гросмайстра Аляксандра Прэсмана.

**№ 123**

**Белыя простыя:** 46, 47, 50, 43, 44, 38, 39, 31, 35, 15 (10)

**Чорныя простыя:** 36, 26, 27, 29, 22, 23, 17, 18, 14, 4 (10)

**№ 124**

**Белыя простыя:** 48, 50, 42, 44, 45, 16, 9 (7)

**Чорныя простыя:** 39, 31, 32, 33, 35, 26, 22 (7)

Астатнія кампазіцыі складзены па правілах бразільскіх шашак.

**№ 125** В. Варушыла (Мінск)

**Белыя простыя:** g1, g3, e5, g5, f6, g7 (6)

**Чорныя простыя:** d2, c3, b4, c5, b6, h8 (6)

**№ 126** А. Баланюк (Цепладар, Адэскай вобл.)

**Белыя простыя:** g1, a3, c5, e5, f6, e7, g7, дамка f8 (8)

**Чорныя простыя:** d2, f2, e3, h4, g5, a7, c7, h8 (8)

**№ 127** Г. Андрэеў (Латвія)

**Белыя простыя шашкі:** c1, b2, a3, c3, g5, b6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** g3, d4, c5, e5, a7, g7 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:** Выпуск № 223 ад 02.08.2024.

№ 114 1. g1-h2 c3:a1 2. c1-b2 a1:c3 3. h6-f8 f4:h6 4. f8:h4 e3-d2 [ 4...d4-c3 5. h2-f4 ]

[ 4...h6-g5 5. h4:c3 e3-f2 6. h2-g3 f2:h4 7. c3-e5 ] 5. h4-g5 h6:f4 6. h2:e1+

№ 115 1. f6-e7 f8:d6 2. h6-f8 f4:h6 3. h2:b4 a5:c3 4. f8:d2 h6-g5 5. d2:h6 d4-c3 6. h6-c1+

№ 116 лег. cd6 (cb6) bc3 (db4) исх. 1. d6-e7 f8:d6 2. g5-f6 e5:g7 3. h6:h4 b4-a3 4. h2:a5 a3-b2 5. a5-c3 b2:d4 6. h4-g5 d4-c3 7. g5-c1+

№ 117 1. b4-c5 d6:d2 2. c1:c5 a3:c1 3. c5-a3 a7:c5 4. a3:f4 c1:g5 5. h4:f6+

№ 118 1. f2-g3 h4:d4 2. c5:e3 a7:c5 3. a1-b2 a3:c1 4. e3-f4 c1:g5 5. h6:f8 +

№ 119 1. c5-d6 c3:e5 2. d2-e3 f4:d2 3. f2-g3 h4:f2 4. g1:c1+

№ 120 1. f4-g5 e3:a3 2. g1:f8 h6:f4 3. f8:c1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013. e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



# ПОСПЕХІ, ЯКІЯ НАТХНЯЮЦЬ, І АПТЫМІЗМ ЯК СТЫЛЬ ЖЫЦЦЯ

## Што пачытаць у жнівеньскім нумары «Алесі»?

### «Я ЗНАЙШЛА СПРАВУ СВАЁЙ МАРЫ»

Мастацкі кіраўнік тэатра эстрадная песні «Сябрынка» Палаца культуры МАЗ Таццяна Трухан лічыць: калі робіш сваю любімую справу з поўнай самааддачай — усё можна пераадолець і скарыць любыя вышыні. Самыя смелыя мары спраўджваюцца дзякуючы таленту і працавітасці.

